Краіна здароўя
Выпуск № 60 (229)

Акцыі

# ЯК НЕ ПРАМАРГАЦЬ МЕЛАНОМУ?

**Рэспубліканская акцыя па прафілактыцы меланомы скуры пройдзе ў краіне 25 лістапада.**

Меланома з'яўляецца адным з самых небяспечных відаў злаякасных пухлін і вылучаецца надзвычай агрэсіўным працяканнем. Яе каварства заключаецца ў тым, што яна можа незаўважна развівацца ў паверхневых слаях скуры на працягу некалькіх гадоў, а затым хутка распаўсюдзіцца ў іншыя органы (лёгкія, галаўны мозг ці печань), дзе ўзнікнуць новыя ачагі яе росту. Устаноўлена, што прыкладна ў палове выпадкаў развіццё меланомы скуры адбываецца з пігментных невусаў, якія сустракаюцца ў 90 працэнтаў людзей. Справакаваць развіццё меланомы могуць як інтэнсіўнае ўльтрафіялетавае выпраменьванне, так і траўматызацыя радзімкі. Траўматызацыя невуса можа быць хранічнай і адбывацца незаўважна для чалавека. Напрыклад, накрухмаленым каўнерыкам кашулі траўміруюцца радзімкі на шыі, а бюстгальтар можа штодня траўмаваць у жанчын радзімкі на целе ці малочных залозах. Таксама хранічна траўмуюцца радзімкі, якія лакалізуюцца ў людзей на падэшвах стоп, далонях, у прамежнасці...

Сярэднія памеры атыповых невусаў, як правіла, перавышаюць памеры «звычайных», бяспечных. Форма гэтых утварэнняў — няправільная, асіметрычная, паверхня — плоская, контуры — невыразныя з размытым краем, пігментацыя — нераўнамерная (цэнтр невуса — аднаго колеру, а край — іншага), з варыяцыямі ад руда-карычневага да цёмнабурага колеру на ружовым фоне. Высокую рызыку развіцця меланомы маюць асобы з прыроджаным гіганцкім пігментным невусам, тым не менш, вядомыя і меланомы памерам у 1 мм.

На развіццё меланомы могуць указваць і рознага кшталту змяненні невуса. Устаноўлена, што пігментныя ўтварэнні на скуры, якія рэгулярна змянялі сваю форму і колер, аказваліся меланомай у 4 разы часцей, чым тыя, знешні выгляд якіх заставаўся нязменным.

Да групы павышанай рызыкі развіцця рака скуры і меланомы адносяцца людзі з белай скурай, рудымі валасамі, блакітнымі, шэрымі і зялёнымі вачыма, аматары «смажыцца» на сонцы, якія перанеслі сонечныя апёкі, а таксама людзі, сваякі якіх хварэлі на меланому ці іншы від рака скуры.

У беларускай сталіцы 25 лістапада акцыя па прафілактыцы меланомы будзе праходзіць на базе кансультацыйна-паліклінічнага аддзялення Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра (праспект Незалежнасці, 64) у кабінетах 118, 120, 208, 322 і 323. З 9 гадзін раніцы і да 15 гадзін усе ахвотныя змогуць наведаць кансультацыйна-паліклінічнае аддзяленне дыспансэра, каб атрымаць кансультацыю ва ўрачоў-анколагаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Занатуй

# Жоўцекамянёвая хвароба: шмат гародніны, меней цукру

**Моцны боль у правай верхняй частцы жывата аддае ў ніжнюю правую частку грудзей, а часам ён ідзе праз плячо ўніз па спіне — так выглядае прыступ жоўцекамянёвай хваробы, які можа цягнуцца як хвіліны , так і гадзіны, не слабеючы. Пры гэтым можа развіцца і запаленне жоўцевага пузыра, прычым настолькі сур'ёзнае, што спатрэбіцца тэрміновая аперацыя.**

Ад камянёў у жоўцевым пузыры і пратоках пакутуе кожны сёмы жыхар планеты. Прычым жоўцекамянёвую хваробу знаходзяць не толькі ў людзей ва ўзросце, але і ў падлеткаў. Аднак, як заўважае **дацэнт другой кафедры хірургічных хвароб Белдзяржмедуніверсітэта Алег РУБАХАЎ**, у жанчын гэта паталогія сустракаецца часцей, што звязана з пэўнымі гарманальнымі працэсамі. Адзначана таксама, што на жоўцекамянёвую хваробу амаль не пакутуюць вегетарыянцы, а рызыкуюць набыць яе тыя, хто харчуецца бялковай ежай, якая ўтрымлівае вялікую колькасць халестэрыну. Аднак правільна падабраная дыета можа істотна паўплываць на ўтварэнне жоўцевых камянёў. Вядома, што пэўныя прадукты валодаюць уласцівасцю раствараць халестэрын. Аднак ёсць і такія, якія правакуюць прыступ жоўцевай колікі.

Дыетолагі рэкамендуюць ужываць больш **агародніны**. Як ужо адзначалася, у вегетарыянцаў жоўцекамянёвая хвароба — даволі рэдкая з'ява. І асабліва паспяхова супрацьстаяць гэтай немачы жанчыны, у якіх у рацыёне харчавання шмат **арэхаў, бабовых і апельсінаў**.

Якое рэчыва ўтрымліваецца ў гэтых прадуктах, што перашкаджае каменеўтварэнню? Магчыма, гэта клятчатка, але верагодней за ўсё — раслінныя бялкі, якія валодаюць здольнасцю зніжаць канцэнтрацыю халестэрыну ў жоўці.

Людзям, якія маюць камяні, **лепш адмовіцца ад кавы**. Чорная кава без цукру і вяршкоў з кафеінам ці без яго можа выклікаць скарачэнні жоўцевага пузыра, якія прыводзяць да прыступу жоўцекамянёвай хваробы. Усяго паўкубка кавы стымулюе скарачэнні жоўцевага пузыра.

Каменеўтварэнню садзейнічае **галаданне, вельмі вялікія перапынкі паміж прыёмамі ежы ці адмова ад сняданку**. Больш за ўсё камянёў у тых, хто не еў па 14 гадзін і больш, прапускаючы снеданні. Менш чым васьмігадзінныя перапынкі здымаюць рызыку каменеўтварэння. Без падтрымкі харчавання стрававальная сістэма не выпрацоўвае з жоўцю дастаткова кіслот, што валодаюць здольнасцю раствараць халестэрын і не даваць яму выпадаць у асадак у выглядзе камянёў.

Нават невялікае **перавышэнне нормы масы цела** абарочваецца пагрозай каменеўтварэння, прычым гэта асабліва датычыцца жанчын сярэдняга ўзросту. Чым большая вага, тым большая рызыка. Поўныя жанчыны ў шэсць разоў часцей церпяць ад жоўцевых камянёў, і нават залішнія 10 кг амаль падвойваюць рызыку.

Лішкі тлушчу ў арганізме пераўтвараюцца ў халестэрын, які ў спалучэнні з жоўцю становіцца асновай каменеўтварэння.

Здавалася б, усё зразумела: калі лішак вагі прыводзіць да каменеўтварэння, лагічна было б хутчэй пазбавіцца ад яе. Але вось парадокс: **хуткая страта вагі — гэта адзін з верных спосабаў справакаваць жоўцекамянёвую хваробу**. Нізкакаларыйная, з нізкім утрыманнем тлушчу дыета (да 600 кілакалорый і менш за 3 г тлушчу ў дзень ) у 50 працэнтах выпадкаў прыводзяць да ўтварэння камянёў у жоўцевым пузыры. І чым хутчэй вы губляеце вагу, тым вышэй рызыка: камяні могуць знаходзіцца ў жоўцевым пузыры, а вы нават і не падазраяце аб гэтым, пакуль вялікая страта вагі і зварот да звычайнага рэжыму харчавання не прывядуць да сімптомаў жоўцекамянёвай хваробы.

Небяспекі можна пазбегнуць, калі да кожнага прыёму ежы дадаваць **па 5-10 г тлушчу (напрыклад, па 2 чайныя лыжкі аліўкавага алею)**.

Тлушч неабходны для таго, каб стымуляваць жоўцевы пузыр выпускаць жоўць, якая ў ім назапасілася, хоць бы раз у дзень. Пры рэзкім скарачэнні ўжывання тлушчу жоўцевы пузыр пачынае радзей скарачацца і выкідаць жоўць у кішэчнік, а застой жоўці вядзе да ўтварэння камянёў.

**Вольга ШАЎКО.**

Прэм'ера рубрыкі «Выйсце з бутэлькі»

# «МНЕ НЕ СОРАМНА КАЗАЦЬ, ШТО Я КАДЗІРАВАНЫ, СОРАМНА ЗА ТОЙ БОЛЬ, ЯКІ ПРЫЧЫНІЎ ЖОНЦЫ І СЫНУ»

«Ужыванне цяжкіх наркотыкаў даступна малой колькасці людзей. Алкагалізм — ён побач з намі... Паспрабуем спыніцца. Жадаю поспеху на гэтым, безумоўна ж, нялёгкім шляху!»

*(Цытата з лекцыі аб шкодзе алкагалізму з фільма «Іголка. Рэмікс»):*

**З Іванам Аляксандравічам (імя зменена па этычных меркаваннях) пазнаёмілася, як часта гэта здараецца, выпадкова. Разгаварыліся. Высветлілася, што новы знаёмы, які, да слова, ніяк не выглядае на свае 60, вось ужо 20 гадоў і кроплі ў рот не бярэ. Хоць быў час, прызнаўся, калі за 20 кіламетраў пешшу за няпоўнай шклянкай гарэлкі пайшоў бы не раздумваючы...**

***— Іван Аляксандравіч, раскажыце, як вы здолелі ўзяць сябе ў рукі і пачаць новае жыццё?***

— Піў я, што тут казаць, моцна. Паміж намі, калі заплюшчу вочы і ўзгадаю, як піў, то і зараз страшна робіцца. Пяць бутэлек «Маскоўскай» адным заходам — вось і ўвесь сэнс жыцця...У 90-м годзе нарадзіўся мой малодшы сын. Вось тады я цвёрда вырашыў, што са скуры вылезу, але мой Ванька будзе жыць у нармальнай сям'і. Сабраўся і паехаў у Мінск кадзіравацца. Урач мяне адразу папярэдзіў, што на ўсё жыццё закадзіравацца немагчыма. Ён проста зменшыць на нейкі час цягу, а ўсё астатняе ў маіх руках. І зараз памятаю яго словы: «Чалавечы розум мацнейшы за гарэлку». Зараз, праз 20 гадоў, я разумею, што вярнуўся, лічы, з таго свету.



***— І што, за 20 гадоў ні разу не сарваліся?***

— Не буду хітраваць, было адзін раз. Як зараз памятаю, калі нарадзіўся ўнук, я на радасцях выпіў за кампанію паўшклянкі шампанскага. Падумаў: ужо сем гадоў прайшло, нічога са мной не стане. Ды дзе там. Пасля шампанскага захацелася гарэлкі.. Два дні я не прасыхаў. А на трэці досвіткам сеў на першую электрычку, што ехала ў бок Мінска, і, ледзь не на каленях, маліў урача, каб ён усыпіў «ільва», які раптоўна прачнуўся і ледзь мяне не загрыз. Пасля таго выпадку я нават піва ў рот не бяру.

***— А як адрэагавалі знаёмыя, суседзі? Не паверу, што не спакушалі.***

— Жонка мая на радасцях торцік купіла. Ведаеце, вельмі важна, каб у гэты пераломны момант побач былі людзі, якія ад душы парадуюцца за цябе. Мне вельмі запомнілася, як да мяне падышоў мой сусед Валера і сказаў: «Віншую. Малайчына. Гэта сапраўдны мужчынскі ўчынак». Згадзіцеся, мала дзе такое пачуеш. У нас жа як: калі ўсе ў гразі, то ўсё ў парадку, а не, дык... Памятаю, выйшаў на двор і чую, як суседка павучае свайго сына Колю: «Паглядзі, Іван закадзіраваўся, жыве як чалавек. А ты чым горшы?». А ўбачыла мяне і ціхенька, каб жонка не чула: «Вань, можа, сто грам хочаш, а то ж ёсць...». Не каб парадавацца, што ў чалавека жыццё наладжваецца, а яна...

***— І як атрымалася не паддацца спакусе?***

— На першых парах мне час ад часу хацелася плюнуць на ўсё і ўзяцца за старое. Злавіў сябе на думцы, што такое жаданне прыходзіла выключна ў тыя моманты, калі з'яўляўся вольны час. Вось я і вырашыў яго запоўніць. Знайшоў сабе занятак па душы: пачаў рамантаваць гадзіннікі, бытавыя прыборы, карацей, усё, што траплялася пад рукі. Менавіта тады і зразумеў, што пасля сарака жыццё толькі пачынаецца *(усміхаецца)*. Акрамя таго, я вельмі моцна ўдзячны сваім калегам-настаўнікам, якія, замест таго, каб казаць «ну што з п'яніцы возьмеш», паверылі ў мяне, зрабілі ўсё магчымае, каб я на працы адчуў сваю неабходнасць. Мой знаёмы, напрыклад, не раз у лячэбна-працоўным прафілакторыі быў. Ніхто яго сур'ёзна не ўспрымаў, для ўсіх ён быў прапашчым чалавекам, пустым месцам. І вось неяк раз на сустрэчы ананімных алкаголікаў пазнаёміўся з былым настаўнікам гісторыі, які пасля таго, як кінуў піць, пачаў сваю справу. Апошні не пабаяўся і ўзяў «прапашчага» на працу. Зараз яны не толькі кампаньёны, але і добрыя сябры. Вось бачыце, давер можа рабіць цуды.

***— Іван Аляксандравіч, асабіста для мяне дзіўна не тое, што вы закадзіраваліся, а тое, што расказваеце гэта мне, зусім незнаёмаму чалавеку...***

— Чаму ж, я і знаёмым расказваю. Ведаеце, мне не сорамна пра гэта казаць, сорамна за той боль, які, пакуль піў, прычыніў сваім блізкім. Акрамя таго, толькі дзелячыся сваім досведам, я ўжо выцягнуў з бутэлькі не аднаго свайго ранейшага сабутэльніка.

***— Праўда? І як у вас гэта атрымалася?***

— Я цвёрда перакананы, што прымусовая кадзіроўка (начальнік сказаў, што, калі не закадзіруешся, звольніць з працы, альбо жонка на развод сабралася падаваць) ні да чаго добрага не прывядзе. Трэба, каб сам чалавек прыйшоў да гэтага рашэння, альбо да гэтай думкі яго падштурхнуў аўтарытэт. Па сабе ведаю, што словы нарколага ўспрымаюцца як павучанне і адлятаюць бы ад сценкі гарох. Памятаю, аднойчы падчас наведвання кабінета нарколага, урач мне пачала чытаць 30-хвілінную лекцыю аб шкодзе алкаголю. А пасля, калі заўважыла, што я яе не слухаю, запыталася, пра што я думаю? І ў адказ на маё «калі б сказалі, што за 20 кіламетраў мяне чакае няпоўная шклянка гарэлкі, то, не раздумваючы, пешшу пайшоў бы...», толькі і вымавіла «такі ты страшны чалавек». Іншая справа, калі прыходзіць да мяне таварыш, з якім мы дагэтуль разам пілі «ўсё, што гарыць». І я наліваю яму гарбаты, расказваю, што, як перастаў піць, дома стала спакойна,

што сыну камп'ютар у крэдыт узялі. «Эх, карыфан, і я б так хацеў!.. А то вось хаджу ў нагавіцах, падвязаных вяроўкай», — нечакана вырываецца ў майго госця. А праз колькі дзён прыходзіць і кажа: «Вань, ты ведаеш, трэба паспрабаваць. Давай з'ездзім да твайго доктара». Але ж, зразумела, не ўсе такія. Некаторыя былыя сабутэльнікі і дагэтуль не ходзяць, а качаюцца. Ці ж гэта жыццё?..

***— Неаднаразова чула, што аматары выпіць вінавацяць ва ўсіх сваіх бедах гены... Што вы можаце сказаць на гэты конт?***

— Якія гены? І слухаць не хачу. Вазьміце, напрыклад, маю сям'ю. Я ўпершыню напіўся да бяспамяцтва ў 4-м класе. Мы тады з таварышамі пілі самагонку, якую знайшлі дома. Наогул, колькі сябе памятаю, ніколі не адмаўляўся выпіць. Але ж пры ўсім пры гэтым мой старэйшы сын — яму зараз 35 гадоў — выпівае толькі па вялікіх святах. Так што, хочаш «завязаць», будзь шчырым з самім сабой і прызнайся: я алкаш, мне піць нельга. А ўсё астатняе — гэта проста адгаворкі.

І, ведаеце, не прывядзі Гасподзь, каб у каго дзеці былі алкаголікамі. На мой погляд, гэта самы страшны праклён з усіх магчымых. У мяне сэрца крывёй абліваецца, калі на ўваходзе ў гарадскі парк бачу піўнушку. Гэта самая што ні на ёсць пастка для моладзі. Лепш бібліятэку ці кавярню зрабілі б, дык не...

**Надзея ДРЫЛА.**

**P.S.** *Ідэю распачаць новую рубрыку падказаў герой гэтай публікацыі. «Я не сцвярджаю, што ўсе, пасля таго як прачыталі маю гісторыю, павінны кінуцца кадзіравацца. Чалавек чалавеку не роўны. Для некага, можа, эфектыўны іншы метад. Напрыклад, выдатны расійскі акцёр Пётр Мамонаў, наколькі я ведаю, адмовіўся ад алкаголю і наркотыкаў пасля звароту ў хрысціянства. Маліцеся Богу, мяняйце месца працы, калі трэба, то і жыхарства. Любым шляхам уцякайце з гэтай ямы. Будзе нялёгка, але толькі на першых парах. А пасля, паверце, будзеце дзякаваць Богу, што вырваліся з бутэлькі, каб нарэшце пачаць жыць, а не існаваць».*

*А як вы (ці ваш блізкі чалавек) знайшлі выйсце з бутэлькі? Падзяліцеся, і хто ведае, магчыма менавіта ваша гісторыя дапаможа вярнуць да жыцця не аднаго чалавека.*



# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Орше

| № п/п | Месторасположение и площадь земельного участка | Начальная цена продажи (руб.) | Условия заключения договора аренды | Инженерное обеспечение участка | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок по ул. Парковой в г. Орше площадью 0,4098 га. Кадастровый номер 242400000001011757 | 26 612 151 | Срок договора – 50 лет. Целевое использование – под торговый центр. Получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка архитектурно-строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года. Начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения архитектурно-строительного проекта и осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией. | В квартале застройки по ул. Парковой, где находится земельный участок, имеются сети водоснабжения, канализации, электрической и телефонной связи с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – имеется, централизованное теплоснабжение – отсутствует, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – отсутствует, централизованное водоснабжение – имеется, наличие железнодорожного подъезда (для производственной зоны) – отсутствует, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – имеется. | 2 661 210 |
| 2. | Земельный участок по ул. Владимира Завадского в микрорайоне «Заднепровье-3» в г. Орше площадью 0,1264 га. Кадастровый номер 242400000004002690 | 1 135 550 | Срок договора – 50 лет. Целевое использование – под торговый центр. Получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка архитектурно-строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года. Начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения архитектурно-строительного проекта и осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией. | В квартале застройки по ул. Владимира Завадского в микрорайоне «Заднепровье-3», где находится земельный участок, имеются сети водоснабжения, канализации, электрической и телефонной связи с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – имеется, участок находится в санитарно-защитной зоне, централизованное теплоснабжение – имеется, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, централизованное водоснабжение – имеется, наличие железнодорожного подъезда (для производственной зоны) – отсутствует, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – отсутствует. | 113 550 |
| 3. | Земельный участок по ул. Мицкевича в г. Орше площадью 0,7073 га. Кадастровый номер 242400000004002688 | 198 100 965 | Срок договора – 50 лет. Целевое использование – под магазин. Получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка архитектурно-строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года. Начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения архитектурно-строительного проекта и осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией. | В квартале застройки по ул. Мицкевича, где находится земельный участок, имеются сети водоснабжения, канализации, электрической и телефонной связи с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – имеется, централизованное теплоснабжение – отсутствует, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, централизованное водоснабжение – имеется, наличие железнодорожного подъезда (для производственной зоны) – отсутствует, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – имеется. | 19 810 090 |
| 4. | Земельный участок по ул. 60 лет БССР в г. Орше площадью 0,0030 га. Кадастровый номер 242400000004002687 | 167 287 | Срок договора – 5 лет. Целевое использование – под торговый павильон. Получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработка архитектурно-строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года. Начало строительства объекта в течение 6 месяцев со дня утверждения архитектурно-строительного проекта и осуществление строительства в сроки, определенные проектно-сметной документацией. | В квартале застройки по ул. 60 лет БССР, где находится земельный участок, имеются сети водоснабжения, канализации, электрической и телефонной связи с возможностью подключения к ним предполагаемого объекта. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: централизованное газоснабжение – имеется, централизованное теплоснабжение – имеется, электроснабжение – имеется, наличие асфальтированного подъезда – имеется, централизованное водоснабжение – имеется, наличие железнодорожного подъезда (для производственной зоны) – отсутствует, доступность автодорог (менее 500 м по прямой) международного и республиканского значения – отсутствует. | 16 720 |

1. Аукцион состоится в 11.00 **28 декабря 2010 г.** в г. Орше в здании Оршанского горисполкома по ул. Островского, 2.

2. Для участия в аукционе необходимо подать заявление. К заявлению прилагаются заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены объекта, а также:

*гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

*индивидуальным предпринимателем* – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

*представителем гражданина или индивидуального предпринимателя* – нотариально удостоверенную доверенность;

*представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица* – доверенность, выданная юридическим лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

*представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

*представителем иностранного гражданина* – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

3. Победитель аукциона обязан:
- подписать протокол аукциона в день его проведения;
- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;
- возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, в течение 10-ти рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка победителю аукциона;
- заключить с Оршанским горисполкомом договор аренды земельного участка;
- в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды земельного участка осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него.

4. Задаток вносится на расчетный счет Оршанского горисполкома № 3642304000494 в ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801647, УНП 300053911.

5. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Орша, ул. Островского, 2, кабинет 18, сектор по управлению госимуществом и приватизации управления экономики Оршанского горисполкома с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **по 24 декабря 2010 года включительно.**

**Контактные телефоны в г. Орше: (8 0216) 21 13 14, 21 12 42.**
**Предварительное ознакомление с объектами торгов — контактный телефон в г. Орше: 24 40 32.**


# НОВЫ ВІРУС ТРАПІЎ «У ТУПІК»

**Новы вірус грыпу H3N2 , выяўлены нядаўна ў ЗША, не ўяўляе сур'ёзнай пагрозы для чалавека. Вынікі даследаванняў, праведзеных амерыканскімі вірусолагамі, сведчаць аб тым, што ён не здольны перадавацца ад чалавека да чалавека.**

Інфармацыю пра новы ўзбуджальнік грыпу, які адрозніваецца ад сезоннага штама, Расія атрымала па каналах Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Паведамлялася, што новы вірус уяўляе сабой камбінацыю генаў трох штамаў вірусаў грыпу, якія цыркулявалі раней. А выдзелены ён быў у двух пацыентаў на тэрыторыі ЗША.

Расійскія спецыялісты звязаліся з Цэнтрам па кантролі за інфекцыйнымі захворваннямі ў Атланце, каб атрымаць больш падрабязную інфармацыю. Высветлілася, што на гэты раз чалавецтву няма чаго баяцца: новы штам вірусу не можа перадавацца ад чалавека да чалавека. Двое жыхароў ЗША, у якіх быў знойдзены новы грып, заразіліся ім ад парсюкоў. А чалавечы арганізм для гэтага штама з'яўляецца тупіком. Значыць, эпідэмічнага распаўсюджвання новы штам грыпу не атрымае.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПОПЫТ НА БЕЛАКАЧАННУЮ

**У жыхара в. Альшаны (Столінскі раён) невядомыя скралі з прысядзібнага ўчастка 2 тоны капусты.**

Устаноўлена, што белакачанную прыхапілі аднавяскоўцы — два трактарысты і муляр. Аднаго з іх раней судзілі за ўгон, а двух — за крадзеж.

І ў жыхара в. Відзібор гэтага ж раёна знікла 900 кг капусты. Зладзеямі аказаліся двое пенсіянераў-аднавяскоўцаў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Дарэчы

# Алкаголь — НЕкарысны і НЕ прадукт харчавання

**Шкода, якую алкаголь наносіць здароўю чалавека, адназначная. Апошнім жа часам надта распаўсюджанымі сталі разважанні пра так званую карысць малых дозаў. Просты чалавек з энтузіязмам на гэта купляецца, а вытворцы градусных напояў радасна паціраюць рукі.**

Сусветная арганізацыя аховы здароўя сапраўды праводзіла спецыяльныя даследаванні адносна ўздзеяння на арганізм чалавека малых дозаў алкаголю. «Пазітыўнае ўздзеянне 30 г абсалютнага алкаголю адзначалася толькі ў дачыненні да кардыяпратэктарнага эфекту, інакш кажучы, у сэнсе зніжэння рызыкі ўзнікнення інфаркту міякарда, — кажа **кіраўнік Цэнтра маніторынгу наркасітуацыі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Сяргей ОСІПЧЫК**. — Такім чынам, размова не ідзе ні пра якую карысць для сасудаў ці іншых органаў і сістэм, — толькі пра сэрца. Па-другое, гэтае пазітыўнае ўздзеянне мела месца выключна ў мужчын ва ўзросце пасля 50 гадоў і жанчын у час менапаўзы».

Дзесьці з 30-х гадоў мінулага стагоддзя алкаголь пачаў пераходзіць у ранг прадуктаў харчавання. Адбылося гэта не без удзелу вядучых вытворцаў і пастаўшчыкоў алкаголю, дзякуючы іх шматбюджэтным маркетынгавым стратэгіям. З таго моманту насельніцтва пры падтрымцы адпаведных піяр-кампаній страціла арыенцір і залічыла «цяжкую ваду» ў прадукты харчавання, якія, як вядома, неабходныя для нармальнага функцыянавання арганізма. Аднак прадукты харчавання — гэта тавар першай неабходнасці. Пра алкаголь жа нічога падобнага сказаць немагчыма.

Той, хто ставіць гэты пасыл пад сумненне, дорага плаціць. І няважна, пра які менавіта алкаголь ідзе размова: віно, гарэлку ці піва. Усё гэта ўтрымлівае этылавы спірт, а значыць, абавязкова аказвае сваё шкоднае ўздзеянне. Так, замежныя даследчыкі ўстанавілі ў жанчын, якія актыўна ўжываюць піва, зніжэнне фертыльнасці. У піўных жа аматараў сярод моцнай паловы назіраецца праблема іншага кшталту: зніжэнне лібіда і адкладанне тлушчу па жаночым тыпе — на жываце і сцёгнах. Піва ўсё ж такі багатае на раслінныя эстрагены — жаночыя палавыя гармоны. Эстрагены хоць і раслінныя, але эфект аказваюць сапраўдны.

Вучоныя таксама ўстанавілі, што ў пакаленнях сем'яў, дзе злоўжываюць алкаголем, прасочваюцца аднолькавыя змяненні ў біяхімічнай актыўнасці ферментаў, якія расшчапляюць алкаголь. Гэта дае падставы для больш хуткага развіцця алкагольнай залежнасці, што можа назірацца літаральна ў падлеткавым узросце.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Студэнцкая ХУТКАСЦЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

г. Мінск.

Лыжаролерная траса на Кастрычніцкай вуліцы.

Пытальнік

# «НЕВЫСАКАРОДНАЯ» РЭАКЦЫЯ

**Ад бранзалетаў з невысакародных металаў на скуры з'яўляюцца мясцовыя высыпанні, якія праходзяць праз некалькі дзён. Ці можна пазбавіцца ад такой рэакцыі на недарагія ўпрыгажэнні?**

**Святлана,** *г. Мінск.*

Упрыгажэнні, а таксама фурнітура для адзення (гузікі, кнопкі, спражкі) са сплаваў невысакародных металаў (нікелю, хрому і інш.) здольныя выклікаць у некаторых людзей кантактны алергічны дэрматыт. Гэта адбываецца ў выніку павышанай адчувальнасці да прадуктаў акіслення металаў.

Такая рэакцыя арганізма не паддаецца карэкцыі, таму адзіны эфектыўны сродак прафілактыкі высыпак — адмова ад «невысакародных» упрыгажэнняў, а таксама ад адзення з металічнымі дэталямі, калі апошнія дакранаюцца да скуры. Звычайна пасля ўстаранення кантакту з алергенам дэрматыт праходзіць самастойна на працягу некалькіх дзён. Можна папрымаць антыгістамінныя прэпараты. У рэдкіх выпадках, калі высыпкі доўга не знікаюць, спецыяліст прызначае мясцовыя глюкакартыкоідныя мазі.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

# ЭРА ЖАНЧЫН

Працяг тэмы

**НАВІНА пра працу над календарам з беларускімі пісьменніцамі выклікала рэзананс. Адразу ўзніклі паралелі з календаром «аголеных пісьменнікаў». Маўляў, прыйшоў час жанчын, калі яны могуць заявіць пра сябе і паказаць сябе. Наогул дзеля чаго патрэбныя такія праекты, навошта гэта кожнай з удзельніц? Дзеля літаратуры, дзеля чытачоў ці саміх сябе? Сёння яны скажуць, што іх прывяло ў праект і паразважаюць пра тое, што значыць адкрытасць творцы.**

**Наталля БАТРАКОВА** не верыць у шалёнае шчасце з нябёсаў: прозвішча такое... Усё, чаго ўдалося дасягнуць, прыйшло праз працу і бяссонныя ночы. А тут незвычайны праект...



— Для мяне гэта ўнікальная магчымасць сустрэцца з чытачамі, ад чаго я ніколі не адмаўляюся. Прызнаюся, прапанову выслухала з асцярожнай цікаўнасцю. Але «запалілася» практычна адразу пасля сустрэчы з людзьмі, якія яго задумалі. Дырэктар скарыў сваім шчырым адказам, што нічога пра мяне і іншых не чуў, не чытаў. І вось вырашыў ліквідаваць гэты прабел такім незвычайным чынам. А заадно і іншым дапамагчы, пазнаёміць з аўтарамі. Я задаволена, што яму паверыла.

Гэта дало шмат станоўчых эмоцый! І падрыхтоўка вобразу, і праца над ім. І перажыванне за ўсіх удзельніц. І знаёмства з Валянцінам Свіягіным, у руках якога апынулася фотакамера, якая ўсіх «палюбіла»! Мы палюбілі адзін аднаго, не зважаючы на тое, хто рускамоўны аўтар, хто беларускамоўны.

***— Пісьменнік ці паэт — гэта чалавек, які павінен «распранацца» ў творах...***

— Любы аўтар так ці інакш раскрываецца на старонках сваіх твораў. Калі не адкрывацца і не ўкладваць душу, кніга не «ажыве», не зачэпіць, яе нават не дачытаюць. Калі ў творы не будзе душы, атрымаецца прыгожы набор слоў, не больш за тое.

***— Якая ступень эратызму для вас прымальная?***

— Прыгожая воку эротыка яшчэ нікому не сапсавала настрой, а тым больш жыццё! Я не ханжа і далёка не «сіняя панчоха», хоць, вядома, накладвае адбітак строгае выхаванне. У сілу шматлікіх фактараў, я, можна сказаць, чалавек іншай эпохі, і поўнае распрананне для мяне мае месца ў трох выпадках: у лазні, перад люстэркам, у ложку з каханым. Таму што гэта натуральна. Да тых, хто можа дазволіць сабе большае, прэтэнзій няма. Гэта асабістая справа кожнага, як і свая ступень разняволенасці, якой часам можна пазайздросціць.

**Дзіяна БАЛЫКА** лічыць: каб сядзець у тэатры ў партэры, трэба набыць лепшы білет. І яна актыўна займаецца рознымі відамі дзейнасці: піша п'есы, працуе і выдае кнігі як псіхолаг.

— Пасля таго, як пісьменнік агаліў перад чытачамі (чытай —



перад усім светам) душу, якія размовы могуць ісці пра агаленне цела? Для мяне душа — значна болей інтымны фактар, чым цялеснасць... Мае кнігі выходзяць у Расіі, таму што ў Беларусі няма кніжнага рынку. Я не імкнуся тут выдавацца, і раблю гэта толькі тады, калі мяне запрашаюць. Напрыклад, просяць выдацца для школьнай праграмы: з 1 верасня «Белы анёл з чорнымі крыламі» дзеці вывучаюць у школе. Аднак я зарабляю ў асноўным у Расіі. А беларускі каляндар у Расіі — наогул не інфармацыйная нагода. Таму трэба глядзець на яго як на маленькае жаночае свавольства. Чаму не паўдзельнічаць, калі саліднае рэкламнае агенцтва прапануе праект з цікавымі мне людзьмі, якіх я ведаю яшчэ з 2004 года? Гэта мяне не бянтэжыць. Таму што я жанчына. Я адчуваю свой гендар — як пол, як праяву маёй сутнасці. Мае эратычныя фотаздымкі вісяць на сценах у маёй кватэры, таму што муж любіць маё цела, гэта яго здымкі, ён ганарыцца, калі бачыць мяне прыгожай. І ўдзел у календары — гэта вясёлая гісторыя, магчымасць працаваць з прафесіяналамі: фатографам Валянцінам Свіягіным, візажыстам Дзіянай Равякай.

***— У вашым блогу ёсць на што паглядзець, напрыклад, фота ў стылі «ню»...***

— Я вельмі люблю сваё цела. Мне яно дастаўляе эстэтычнае, фізіялагічнае задавальненне. Як псіхолаг, лічу, што гэта надта вялікая праблема, калі чалавек свайго цела саромеецца. Вугры, лішняя вага, дрэнны зрок — праявы нявыказаных эмоцый, псіхалагічных праблем. Цела — той футляр, які ўсё жыццё будзе насіць тваю цудоўную душу, творчасць. Няўжо яно не заслугоўвае пашаны за сваю вялікую працу? Я ведаю, што такое цела, як пісьменнік, таму што ў мяне часам баліць спіна: я вельмі шмат часу праводжу за камп'ютарам...

Гэта не першая мая фотасесія такога парадку. Я здымалася для выдавецтва «Эксмо», у мяне ёсць кніга «Давай зоймемся каханнем. Сэкс вяртаецца». Там на вокладцы маё фота ў стылі «ню». У мяне нават была ідэя рабіць праект, дзе я на вокладцы кнігі буду з'яўляцца аголенай. Праект, які б называўся «Псіхолаг, які ад вас нічога не хавае»...

У мяне вельмі мала ў жыцці абмежаванняў, магчыма, акрамя двух — Крымінальны кодэкс і ўласнае сумленне. Не парушаю ніводнага з гэтых пунктаў удзелам у праекце. Я ўсё калібрую праз уласны стан. Мне камфортна быць прыгожай, у грыме, у іншым грыме, без грыму...

**Тамара ЛІСІЦКАЯ** ўпэўненая, што ўдзел у праектах і стварэнне інфармацыйных падстаў — норма



медыйнага жыцця:

— Падазраю, што і не медыйнага таксама, а ўвогуле нармальнага жывога жыцця. Любы праект — дзеянне. Ужо хоць бы таму я і пагадзілася. Калі ніхто не будзе нічога выдумляць, у прасторы наступіць цудоўная цішыня, але гэта будзе дакладна не мая прастора.

Мне гэты праект даў незвычайны новы вопыт. Па-першае, было прыемна, што мне, тройчы маме, так адназначна далі зразумець: я прыгожая. Далі зразумець, што свет у кантэксце гэтай тэмы не развіваецца лінейна па законах камерцыйных карпарацый, якім лепш за ўсё прасоўваць у якасці эталона юную бяздзетную дзяўчыну. Я — жанчына. Колькі б я ні важыла, якой бы даўжыні ў мяне ні былі ногі, колькі б мне ні стукнула гадоў — я прыгожая! Вось думка, у якой імкнулася і іншых мужных і цудоўных лэдзі пераканаць, і якой сама прытрымліваюся. Мы — моцныя, разумныя, цярплівыя, шмат перажылі, наплакаліся, са шрамамі... Але мы заўсёды будзем прыгожымі... Дарэчы, я важу роўна столькі ж, колькі на першым курсе ўніверсітэта. Чаму б мне і гэтым не ганарыцца? Па-другое, я са здзіўленнем адкрыла для сябе бязмежную зайздрасць парачкі таварышаў па літцэху. Стала асцярожней, гэта добра. Хто б мог падумаць, што бяскрыўдны праект выступіць такім лакмусам? Па-трэцяе, адкрыла для сябе некалькі новых імёнаў сярод удзельніц календара. Думаю, цяпер мы моцна пасябруем.

***— Наколькі вы адкрыты чалавек у творчасці і ў жыцці?***

— Абсалютна адкрыты. Па вызначэнні бачу ў любым чалавеку сябра. Здзіўлена, што можа быць інакш... А наконт распрананняў... Літаратар перш за ўсё павінен быць адэкватным часу, жыць у ім, быць тым самым чалавекам, для якога ён піша. Часовы і падзейны кантэкст, у якім я жыву, прадугледжвае шмат кантрастаў — ад побытавага подзвігу да свецкага жыцця, ад болевага шоку да абдымкаў з каханым. І гэта нармальна. Я не разбіваю падзеі свайго жыцця ў розныя плыні — вось тут духоўнае, а тут можна і эротыкі дадаць. Я — гэта складаная канструкцыя з усімі опцыямі, з усялякім вопытам. Менавіта пра гэта я пішу, менавіта так і паступаю. Але ў любой маёй справе мегапланавае — дадаць святла, даць надзею, падтрымаць.

**Вольга АКУЛІЧ** лічыць: тое, што не супярэчыць заканадаўству, мае права на існаванне.

— У гэтым праекце мяне цікавілі, па-першае, яго мастацкія складнікі, таму што канцэптуальна гэта было вельмі цікава. Мне здавалася, што гэта вельмі слушная ідэя —прыгожа паказаць беларускіх літаратараў, прычым і рускамоўных, і беларускамоўных. Гэта першае. Па-другое: для мяне гэта быў цікавы новы вопыт, таму што я не фотамадэль, я не здымалася ў фотавыданнях, хоць і працавала доўгі час у эфіры, здымалася ў кліпах. Сама фотасесія мне вельмі спадабалася, было цікава. Так, у мяне нечаканы вобраз, які не падобны на мой вобраз у жыцці. Гэта свайго роду творчы эксперымент. Для любой творчай асобы цікава час ад часу выходзіць за рамкі свайго вобраза. Як чалавеку, які працуе ў тым ліку з візуальнымі сродкамі масавай інфармацыі, які мае дачыненне да тэлебачання, вельмі цікава патрапіць па той бок экрана.



Акрамя таго, я звычайна як рэжысёр і прадзюсар працую з іншымі людзьмі, часам прапаную ім незвычайныя вобразы, становішчы. Тут мне было цікава, як мяне пабачаць іншыя людзі, тыя ж візажысты альбо фатографы.

***— Як вы наогул ставіцеся да эратычных фотасесій?***

— Станоўча. Калі гэта прыгожа, па-мастацку, то станоўча. Калі непрыгожа, то адмоўна. Больш за тое, я так стаўлюся да любых фотасесій. І да афіцыйных здымкаў. Бо няма нічога больш жахлівага, чым афіцыйныя здымкі на Дошцы гонару, калі ўсе зашпіленыя і з пратакольнымі тварамі. У тым, што ў чалавека ёсць цялеснасць, няма нічога кепскага.

**Вольга ГАПЕЕВА** — беларуская паэтка, якая надае асаблівую ўвагу роўнасці палоў. У яе хацелася спытаць, ці можна лічыць «жаночы» каляндар адказам на «аголеных літаратараў», якія паўсталі летась у календары на 2010 год?



— Не думаю, што жаночы пісьменніцкі каляндар з'яўляецца адказам на мужчынскі каляндар, які выйшаў летась. Нягледзячы на тое, што там нібыта аголеныя літаратары, ніякай аголенасці там няма. З пазіцый візуальнай антрапалогіі там усе апранутыя. Наогул, распрануць мужчыну і распрануць жанчыну — розныя рэчы... У тым сэнсе, што паказаць голыя ногі ці торс мужчыны — яшчэ не значыць яго «распрануць»,ператварыць з суб'екта ў аб'ект.

Магчыма, ініцыятары праекта ведаюць пра той каляндар, але іх матывы, напэўна, былі іншыя, чым жаночы «адказ». Калі мне патэлефанавалі і папрасілі паўдзельнічаць, то я падумала: а чаму не? У мяне быў летні месяц, таму свой вобраз я бачыла ў сукенцы, у якой прахадзіла ўвесь жнівень. Матыў удзелу: стаць бачнай у грамадстве, якое асабліва не прапануе магчымасцяў жанчыне-аўтарцы, як выйсці да шырокага чытача. Мне здаецца, для кожнай гэта проста магчымасць, каб цябе пабачыла большая колькасць людзей, каб заўважылі імя. Можа, зацікавяцца беларускай літаратурай і літаратурай увогуле. Бо калі на каляндар змясцілі, значыць, чалавек мае нейкую вагу, хоць, вядома, гэта і не факт, але масавы спажывец так звычайна і думае.

Мне цікава тое, што атрымліваецца пасля ўсяго. Я падазравала, што можа адбыцца такі ажыятаж. Але з іншага боку гэта мяне трошкі засмучае, таму што, напрыклад, нядаўна адбываўся гендарны маршрут, прысвечаны праблемам фемінізму і гендарным пытанням. Чамусьці пра гэтую сур'ёзную падзею амаль ніхто не пісаў і такога ажыятажу яна не выклікала... Таму мне асабіста не хацелася б, каб потым навешвалі цэтлікі, ці казалі, што жанчыны здатныя толькі на тое, каб прыгожа здымацца ў календарах.

**Валярына КУСТАВА**, паэтка, якая любіць выраз «далягляд не церпіць трох», у любых умовах думае пра тое, што галоўнае для яе, і ў адпаведнасці з гэтым прымае рашэнні.



— Ад пачатку я думала, што гэта будзе каляндар беларускіх пісьменніц, так было пададзена. Паколькі я даволі шмат выступаю, заўсёды стараюся данесці нейкі кавалачак беларускасці да як мага большай аўдыторыі, і, калі ў мяне з'яўляецца такі шанц, выкарыстоўваю яго. Бо гэта не штосьці распуснае ці непрыстойнае, не. Калі будуць прэзентацыі, то ўзнікне яшчэ адна нагода сустрэцца з чытачамі, гледачамі. Няхай будзе першым крокам, прынамсі з майго боку, каб данесці да іх нейкую часцінку культуры. Можа, да тых, хто раней пра яе не пачуў. Вядома ж, думала, што гэта будзе менавіта культурна засяроджаны, зарыентаваны на беларускасці каляндар. Але ён трохі змяніў канцэпцыю. Ну што ж! Мы будзем працаваць з тым, што маем. З аднаго боку, я мушу падзякаваць арганізатарам, якія зрабілі гэты каляндар. Бо такі цікавы досвед, фотаздымкі, якія проста так не маглі б з'явіцца.

***— Лічыцца, што творчая асоба павінна адкрываць душу...***

— Гэта было першае, пра што я казала, калі зайшла ў студыю. Калі я паглядзела на некаторыя фотаздымкі, якія мне былі прапанаваныя, я сказала, што разумею гэты праект як адкрыццё, паказ сутнасці сваёй творчасці. Калі хтосьці будзе паказваць аголенае цела, то я буду паказваць аголеную душу. У прынцыпе я пастаралася справіцца з гэтай задачай, якую сама ж сабе паставіла. У маіх вачах, я думаю, вы зможаце ўбачыць аголеную душу, што ў прынцыпе адпавядае маёй творчасці.

Падрыхтавала **Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Сакрэт поспеху ў год Ката — хуткасць і дзеянне

**ЗГОДНА з Усходнім календаром, надыходзячы 2011 год будзе годам Ката (Труса). Чым ён вызначыцца, якія новыя настроі з сабой прынясе, нашым чытачам расказаў астролаг Уладзімір ВАСЮК.**

— Абодва сімвалы года — што кот, што трус — жывёлы рухомыя, імклівыя, дынамічныя, таму наступны год прынясе нам дынаміку і павышаную актыўнасць. **Самым галоўным прынцыпам стане хуткасць, ініцыятыва. Прыйшоў час змяніць абарончую тактыку на наступальную, заваёўніцкую. Час атакаваць. Пераможа той, хто дзейнічае.**

Нягледзячы на пушыстасць і ласкавасць жывёл-татэмаў года, 2011-ы стане адным з самых дынамічных, актыўных і няпростых для большасці людзей, бо запатрабуе дзеянняў, учынкаў, скіраваных на дасягненне хуткіх вынікаў. Менавіта колькасцю такіх канкрэтных дзеянняў і будзе вымярацца паспяховасць у надыходзячым годзе.

Такім чынам, **сакрэт поспеху ў год Ката — хуткасць і дзеянне, скіраванае на тэрміновыя вынікі.**

Прынцып года праявіць сябе і ў палітыцы, і ў міжнародных стасунках: стане больш дынамізму, агрэсіі, абвострацца канфлікты. Прычым, **татэмы года ў большасці выпадкаў будуць на баку ініцыятараў канфліктаў і дапамогуць ім заваяваць перамогу, таму не трэба баяцца паражэння, лепш актыўна наступаць на тых франтах, якія маюць для вас вялікае значэнне** і дзе б даўно хацелася адсвяткаваць вікторыю. Але гэта не азначае, падкрэсліў астролаг, што ўвязвацца ў бойку трэба абсалютна бяздумна, не зважаючы на колькасную перавагу сіл праціўніка і сваю нявыгадную пазіцыю. Спярша мае сэнс цвяроза ацаніць сітуацыю, прыкінуць шанцы на поспех і — толькі калі яны даволі высокія — рушыць у наступленне. Важна, каб у вас хапала сіл і рэсурсаў на той учынак, які вы хочаце здзейсніць, але яшчэ важней — вера ў станоўчы вынік сваіх намаганняў.

**Яшчэ адзін прынцып наступнага года — навучыцца жыць сённяшнім днём**, цяперашнім момантам, зыходзячы са сваіх наяўных рэсурсаў, паспрабаваць перанесці аб'ект мары ў рэальнасць і ўвасобіць ідэю ў жыццё. **Кожны дзень рабіць нешта канкрэтнае для дасягнення сваёй мэты. Хопіць адкладваць свае планы і мары! Настаў час ажыццявіць іх!** Даўно хацелі кінуць курыць, запісацца ў фітнэс-клуб, стварыць сям'ю? Калі гэта так, то дзейнічайце, а не адкладайце на больш доўгатэрміновы перыяд. **Рэалізуйце тое, пра што даўно марылі, а сімвалы года вас падтрымаюць.**

Як сцвярджае мудрая японская прымаўка: хочаш быць кімсьці — будзь ім!

У многіх з нас атрымаюць шанц на рэалізацыю справы і праекты, якія гадамі не маглі ажыццявіцца. А тым, у каго апошнім часам справы не ладзяцца, а стрэлка эмацыянальнага барометра трывала завісла над рыскай «пахмурна», астролаг раіць узгадаць свае мінулыя перамогі і дасягненні, хай сабе і невялікія.

— Выхад з цяжкага становішча варта пачынаць з успамінаў аб ранейшых перамогах, аб тым лепшым і светлым, што з вамі адбылося ў папярэднія гады. Такі настрой дапаможа атрымаць станоўчы імпульс і змяніць жыццё да лепшага.



У 2011 годзе не варта адразу замахвацца на вялікія перамогі, адзначыў Уладзімір ВАСЮК. Вялікія перамогі патрабуюць вялікіх намаганняў. **Галоўнае — зрабіць перамогу ладам жыцця, кожны дзень ажыццяўляць нейкія дробныя пазітыўныя перамены, навучыцца дасягаць маленькіх перамог кожны дзень, каб яны пацягнулі за сабой перамогі вялікія.** Штодзённыя і паслядоўныя намаганні ў вызначаным кірунку абавязкова дапамогуць вам дасягнуць поспеху ў наступныя 12 месяцаў.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

## КАНТРАБАНДНЫЯ ЦЫГАРЭТЫ І «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»

Супрацоўнікі віцебскай мытні на чыгуначнай станцыі ў Полацку затрымалі буйную партыю кантрабандных цыгарэт, якія ў чыгуначным вагоне спрабавалі перавезці за мяжу пад выглядам торфабрыкету. Вагон з «брыкетамі на аснове торфу» згодна з суправаджальнымі дакументамі накіроўваўся ў Латвію. Але мытнікі атрымалі аператыўную інфармацыю пра кантрабанду. У выніку знайшлі ў вагоне больш за 8,3 мільёна штук цыгарэт расійскай вытворчасці двух найменняў. Пачкі ляжалі ў каробках сярод торфабрыкету. Пачаты адміністрацыйны працэс, у выніку якога матэрыялы будуць перададзеныя ў суд. Хутчэй за ўсё, цыгарэты будуць канфіскаваныя.

У Аршанскім раёне на трасе Брэст—Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі ля пасёлка Высокае супрацоўнікі дзяржаўтаінспекцыі затрымалі аўтамашыну «Інтэрнацыянал», якой, як потым высветлілася, кіраваў грамадзянін Расіі. Мужчына перавозіў без адпаведных суправаджальных дакументаў 6,5 тоны лому каляровага металу і 2,6 тоны лому чорнага агульным коштам 7,6 мільёна рублёў. Склалі адміністрацыйны пратакол. Груз канфіскавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Памежнікі не дрэмлюць

Непадалёку ад беларуска-польскай мяжы памежнікі затрымалі трох грузін, якія ноччу спрабавалі «перакусіць» сігналізацыю, каб затым перайсці мяжу. Было ўстаноўлена, што адзін з іх ужо шмат разоў спрабаваў легальна выехаць у Польшчу і Літву, але памежнікі гэтых краін вярталі яго назад. Пасля гэтага грузін сустрэў двух землякоў, і яны ўжо разам вырашылі нелегальна пранікнуць у Польшчу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


**ЗАВЕРЕНО**
Директор Департамента
по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
Гальперин А.Л.
18.11.2010

ТЕХНОБАНК

**УТВЕРЖДЕНО**
Протокол Наблюдательного Совета
ОАО «Технобанк»
29.10.2010 № 34

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ТЕХНОБАНК»

**1. Наименование.**
На белорусском языке:
полное – Адкрытае акцыянернае таварыства «Тэхнабанк», сокращенное – ААТ «Тэхнабанк».
На русском языке:
полное – Открытое акционерное общество «Технобанк», сокращенное – ОАО «Технобанк».

**2. Место нахождения, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**
Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.
Тел/факс: +375 17 283 15 05
Адрес в интернете: www.technobank.by
E-mail: info@technobank.by

**3. Номера расчетных счетов, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций.**
№ 3811800010014 в ОАО «Технобанк», код 182 (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, не являющихся банками).
№ 1811800010016 в ОАО «Технобанк», код 182 (для банков).

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором публикуется бухгалтерская отчетность.**
Годовая бухгалтерская отчетность эмитента публикуется в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным, также с данной информацией можно ознакомиться на сайте ОАО «Технобанк» по адресу: **www.technobank.by.**

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, его местонахождение, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия лицензии.**
ОАО «Технобанк» обслуживает депозитарий ОАО «Технобанк», расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/0385568, выданного Министерством финансов Республики Беларусь, срок действия – до 22 июня 2014 года.

**6. Размер уставного фонда, количество акций по категориям и типам привилегированных акций, номинальная стоимость акций.**
Сумма зарегистрированного уставного фонда составляет 46 586 939 800 (Сорок шесть миллиардов пятьсот восемьдесят шесть миллионов девятьсот тридцать девять тысяч восемьсот) белорусских рублей.
Уставный фонд разделен на 24 519 442 (Двадцать четыре миллиона пятьсот девятнадцать тысяч четыреста сорок две) акции, из них простых (обыкновенных) акций 24 455 229 (Двадцать четыре миллиона четыреста пятьдесят пять тысяч двести двадцать девять) штук и привилегированных акций 64 213 (Шестьдесят четыре тысячи двести тринадцать) штук. Номинальная стоимость акций – 1 900 (Одна тысяча девятьсот) рублей.

**7. Дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего.**
Эмитент зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь как ООО СКБ «Технобанк» 5 августа 1994 года, регистрационный номер № 47, преобразован в ОАО СКБ «Технобанк» 1 июня 1995 года, переименован в ОАО «Технобанк» 5 мая 2000 года. ОАО «Технобанк» (далее – Банк) является правопреемником всех прав и обязанностей ЗАО «Торгово-Промышленный банк», ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

**8. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.**
Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу:
- в офисе ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 с 9.00 до 16.00 в рабочие дни;
- на интернет-сайте эмитента: www.technobank.by.

**9. Дата принятия решения о выпуске облигаций, номер протокола и наименование органа, принявшего это решение.**
Решение о выпуске облигаций принято Наблюдательным Советом ОАО «Технобанк» «29» октября 2010 года, протокол № 34.

**10. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.**
К открытой продаже предлагаются 190 000 (Сто девяносто тысяч) именных дисконтных облигаций в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).
Серия «ТБ-5», номера «000001 – 190000».
Объем эмиссии составляет 19 000 000 000 (Девятнадцать миллиардов) белорусских рублей.

**11. Номинальная стоимость облигаций.**
100 000 (Сто тысяч) белорусских рублей.

**12. Цель выпуска облигаций.**
Облигации выпускаются с целью привлечения свободных денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для формирования ресурсной базы банка.

**13. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**
Исполнение обязательств по облигациям обеспечивается залогом. В качестве предмета залога по облигациям выступают следующие объекты недвижимости:

| № п/п | Наименование объектов | Рыночная стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным № 500/D-7021882, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, д. 44, пом. 4, назначение – Административное помещение | 3 744 564 290 |
| 2 | Изолированное помещение с инвентарным № 500/D-7021883, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, д. 44, пом. 3, назначение – Административное помещение | 6 049 645 258 |
| 3 | Изолированное помещение с инвентарным № 500/D-704738, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, д. 8, пом. 7П, назначение – Административное помещение | 14 685 066 466 |
| | ИТОГО | 24 479 276 014 |

Независимая оценка произведена 11 октября 2010 г. ООО «ЕВРОНЕДВИЖИМОСТЬ КОНСАЛТ» Республика Беларусь, 220029, г. Минск, пр. Машерова, д. 17, к. 114Г, заключение об оценке № 11/10-10/1.

**14. Период проведения открытой продажи облигаций.**
Дата начала продажи: 29 ноября 2010 года.
Дата прекращения продажи: 29 августа 2011 года.

**15. Место и время проведения открытой продажи облигаций.**
Открытая продажа (размещение) осуществляется:
- на внебиржевом рынке по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 с 9.00 до 16.00 в рабочие дни на основании договора первичного размещения облигаций;
- на биржевом рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с регламентом торгов.

**16. Срок обращения облигаций.**
с 29 ноября 2010 года до 29 ноября 2012 года (731 день).

**17. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций.**
Погашение облигаций осуществляется по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 в ОАО «Технобанк» с 9.00 до 16.00 в рабочие дни, начиная с 29 ноября 2012 года.
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций. Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций.
Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев в день погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций. Списание денежных средств производится по реквизитам последнего держателя, указанного в реестре владельцев облигаций ОАО «Технобанк», сформированном депозитарием эмитента за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций. Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета эмитента по реквизитам владельцев облигаций.
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете банка до непосредственного обращения владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При погашении облигаций владельцам возмещается номинальная стоимость облигаций денежными средствами в сумме и валюте номинала облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**18. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты.**
Цена продажи облигаций в период открытой продажи устанавливается эмитентом из расчета 14 % годовых к погашению.
Годовая доходность по облигациям рассчитывается по следующей формуле:

$$Дг = \frac{(Н–Ц) \times 100}{Ц} / \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right),$$

где:
Дг – годовая доходность по облигациям (процентов годовых);
Н – номинальная стоимость облигаций;
Ц – цена продажи облигаций;
Т365 – количество дней срока обращения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней до погашения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Количество дней до погашения облигаций определяется со дня их продажи по день погашения. При этом день продажи и день погашения считаются одним днем.
Текущая стоимость облигаций рассчитывается по следующей формуле:

$$С = Ц + \frac{Ц \times Д}{100} \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right),$$

где:
С – текущая стоимость облигаций;
Ц – цена продажи облигаций, установленная эмитентом в день начала открытой продажи;
Д – доходность, рассчитанная исходя из цены продажи на дату начала размещения облигаций (процентов годовых), установленная эмитентом;
Т – количество дней обращения дисконтных облигаций данного выпуска. Количество дней обращения дисконтных облигаций определяется с даты начала их размещения по дату расчета их текущей стоимости. При этом день начала размещения дисконтных облигаций и день расчета их текущей стоимости считаются одним днем;
Т365 – количество дней срока обращения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней до погашения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Расчет цены продажи и текущей стоимости облигаций осуществляется исходя из фактического количества дней в году.
При расчете количества дней срока обращения (до погашения) и периода начисления дохода первый и последний дни срока (периода) считаются одним днем. При этом, если срок (период) делится переходом с календарного года, состоящего из 365 дней, на календарный год, состоящий из 366 дней, либо наоборот, то при определении значений Т365 и Т366 уменьшается количество дней в первой части периода независимо от количества дней в календарном году.
При определении текущей стоимости и цены продажи облигации, расчет дохода производится по каждой облигации с точностью до одного рубля с округлением в соответствии с Правилами начисления процентов в банках Республики Беларусь.
Облигации продаются по цене ниже номинальной стоимости и погашаются по номинальной стоимости.
Доходом у держателя облигаций является дисконт, который в случае приобретения облигаций до погашения рассчитывается по формуле:

$$Д = Н - Ц,$$

где:
Д – дисконт (доход);
Н – номинальная стоимость облигаций;
Ц – цена покупки облигации.
В случае досрочного выкупа облигаций эмитентом доход рассчитывается по формуле:

$$Д = Цв - Ц,$$

где:
Д – дисконт (доход);
Цв – цена выкупа эмитентом;
Ц – цена покупки облигации.

**19. Минимальная цена продажи облигаций.**
78 123 (Семьдесят восемь тысяч сто двадцать три) белорусских рубля.

**20. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций.**
При запрещении выпуска облигаций эмитент в месячный срок с момента получения от регистрирующего органа уведомления о запрещении выпуска облигаций возвращает инвесторам средства, полученные в оплату размещенных облигаций.

**21. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия конвертации, условия и порядок досрочного погашения облигаций.**
Эмитент имеет право выкупать облигации по договорной цене в течение всего срока обращения. Выкуп облигаций осуществляется эмитентом на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и/или на биржевом рынке в порядке, установленном ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Эмитент имеет право продавать на вторичном рынке облигации по договорным ценам.
Эмитент имеет право досрочно погасить выкупленные облигации с прекращением обязательств по облигациям в силу совпадения должника и кредитора в одном лице согласно статье 383 Гражданского кодекса Республики Беларусь.
Эмитент имеет право совершать иные операции с облигациями, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.
Конвертация облигаций не производится.

**22. Дата и номер государственной регистрации облигаций.**
№ 5-200-02-0850 от «18» ноября 2010 года.

**Председатель Правления** **Д.Л. Михалевич**

**Главный бухгалтер** **Н.А. Кузьмицкая**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010 г.*

# САБРАЦЬ. АЧЫСЦІЦЬ. ЗНІШЧЫЦЬ

## У Беларусі распрацаваны праект Нацыянальнага плана па выкананні Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках на 2011—2015 гады

**Не сакрэт, што адной з асноўных прычын добрага здароўя кожнага чалавека з'яўляецца стан навакольнага асяроддзя, і гэты факт набыў асаблівую актуальнасць менавіта ў мінулым стагоддзі — у сувязі з шырокім распаўсюджваннем выкарыстання разнастайных хімічных сумесяў і злучэнняў. Пры гэтым медыкі былі вымушаныя канстатаваць: далёка не ўсе з іх з'яўляюцца бяспечнымі. А адной з найбольш вострых праблем у свеце прызнаныя так званыя стойкія арганічныя забруджвальнікі — САЗ. Нездарма ў 2001 годзе міжнароднай супольнасцю была прынятая Стакгольмская канвенцыя аб стойкіх арганічных забруджвальніках, якая вызначыла дакладныя патрабаванні па абарачэнні САЗ. Не засталася ўбаку і наша краіна — Беларусь далучылася да канвенцыі ў снежні 2003 года.**

### ПЕРШЫЯ КРОКІ. ПАТРЭБНЫ ПРАЦЯГ

Як бок Стакгольмскай канвенцыі наша краіна ўзяла на сябе шэраг абавязкаў. І ў тым ліку — па правядзенні маніторынгу ўтрымання стойкіх арганічных забруджвальнікаў у навакольным асяроддзі, ацэнцы ўздзеяння САЗ, распрацоўцы аналітычных метадаў вымярэння САЗ, спыненні выкарыстання поліхларыраваных біфенілаў (ПХБ) да 2025 года, абясшкоджванні адходаў, якія ўтрымліваюць ПХБ, выяўленні тэрыторый з высокай канцэнтрацыяй ПХБ, выяўленні і маркіроўцы абсталявання з утрыманнем ПХБ і г.д. Для дакладных пакрокавых дзеянняў быў распрацаваны Нацыянальны план выканання абавязкаў, прынятых Рэспублікай Беларусь па Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках на 2007—2010 гады і да 2028 года. Нацплан зацверджаны ўказам кіраўніка дзяржавы. Прычым ужо сёння ёсць падставы казаць аб выкананні мерапрыемстваў гэтага дакумента.

Так, у нашай краіне былі вызначаныя Правілы абыходжання з непрыдатнымі пестыцыдамі; зацверджаныя Правілы абыходжання з абсталяваннем і адходамі, якія ўтрымліваюць поліхларыраваныя біфенілы; распрацаваны шэраг нацыянальных стандартаў па выкідах ад стацыянарных крыніц і вызначэнні масавай канцэнтрацыі ПХДД/ПХБФ і дыяксінападобных ПХБ, ацэнцы якасці вады і якасці глебы; распрацаваны тэхнічны кодэкс устаноўленай практыкі ў дачыненні да выкідаў САЗ у атмасферу; створаныя асобныя банкі звестак пэўных аб'ектаў навакольнага асяроддзя (воды, донныя адкладанні і завесі, глебы), наладжана вядзенне спецыялізаванай базы звестак маніторынгу стойкіх арганічных забруджвальнікаў; праводзіцца штогадовая работа па актуалізацыі баз звестак аб пестыцыдах, аб'ектах іх размяшчэння і тэрыторыях, забруджаных пестыцыдамі, аб поліхларыраваных біфенілах, абсталяванні, матэрыялах і адходах, якія ўтрымліваюць поліхларыраваныя біфенілы, тэрыторыях, забруджаных ПХБ, аб крыніцах выкідаў стойкіх арганічных забруджвальнікаў у выніку іх ненаўмыснай вытворчасці.

Адначасова ў Беларусі была праведзена работа па пераўпакоўцы непрыдатных пестыцыдаў, якія засталіся на захоўванні ў сельгаспрадпрыемствах; праведзены інжынерна-тэхнічныя мерапрыемствы па зніжэнні шкоднага ўздзеяння непрыдатных пестыцыдаў, якія знаходзяцца ў Слонімскім, Верхнядзвінскім, Пастаўскім, Гарадоцкім, Дрыбінскім, Петрыкаўскім захаваннях; адноўлены пад'язныя шляхі, абвадныя каналы для адтоку талай вады, агароджы, назіральныя свідравіны; захаванні ўкрыты плёнкай або дадатковым слоем гліны, тут устаноўлены аншлагі. Цалкам ліквідавана Гяршонскае захаванне непрыдатных пестыцыдаў на Брэстчыне, вядзецца ліквідацыя Петрыкаўскага захавання.

Паводле Нацыянальнага плана праведзена інвентарызацыя і маркіроўка абсталявання, якое ўтрымлівае поліхларыраваныя біфенілы, міністэрствамі і ведамствамі распрацаваныя і зацверджаныя галіновыя праграмы па вывадзе з эксплуатацыі і дастаўцы на перапрацоўку абсталявання з утрыманнем ПХБ, вядзецца мэтанакіраваны вывад з выкарыстання небяспечных кандэнсатараў і трансфарматараў, складзены і абноўлены пералік тэрыторый, забруджаных поліхларыраванымі біфеніламі.

Не менш адметны крок — закупка храматаграфічнага абсталявання для выканання якаснага ўтрымання стойкіх арганічных забруджвальнікаў у аб'ектах навакольнага асяроддзя. Паралельна для адсочвання стану здароўя насельніцтва распрацаваная методыка адначасовага вызначэння рэшткавых колькасцяў поліхларыраваных біфенілаў і хлараргнічных пестыцыдаў у грудным жаночым малацэ і прадуктах жывёлагадоўлі з дапамогай вадкаснай храматаграфіі; распачатыя праверкі мяса, малака, мясных і малочных прадуктаў, рыбы.

Яшчэ адзін напрамак — скарачэнне выкідаў стойкіх арганічных забруджвальнікаў у выніку іх ненаўмыснай вытворчасці. З гэтай мэтай вядзецца актыўная работа па мадэрнізацыі газаачышчальнага абсталявання.

І, апроч таго, распачата шырокая кампанія па інфармаванні насельніцтва аб праблеме САЗ — праз друкаваныя і электронныя СМІ, інтэрнэт. Наладжана правядзенне конкурсу праектаў грамадскіх арганізацый, накіраваных на павышэнне дасведчанасці жыхароў Беларусі наконт стойкіх арганічных забруджвальнікаў. Нарэшце, паводле патрабаванняў Стакгольмскай канвенцыі, арганізавана перыядычнае прадастаўленне звестак яе ўдзельнікам аб выкананні абавязацельстваў, якія прыняла на сябе Беларусь.

— Паводле Нацыянальнага плана выканання абавязкаў, прынятых Рэспублікай Беларусь па Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках на 2007—2010 гады і да 2028 года, праведзена па-сапраўднаму вялікая работа, — адзначае намеснік начальніка ўпраўлення абыходжання з адходамі — начальнік аддзела рэгулявання абыходжання з адходамі Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя Вольга Сазонава. — І ўсё ж даводзіцца канстатаваць: пакуль зроблена яшчэ далёка не ўсё. І ў сувязі з гэтым нашым міністэрствам распрацаваны, узгоднены з зацікаўленымі структурамі і накіраваны на разгляд урада Нацыянальны план на перыяд 2011—2015 гадоў.

### ПРАГАЛ КАНТРАКТАМ НЕ СПРЫЯЕ

Варта нагадаць: у Беларусі сфарміраваная нарматыўна-прававая база, якая рэгламентуе абыходжанне з непрыдатнымі пестыцыдамі. Распрацаваны таксама шэраг стандартаў і тэхнічных умоў у дачыненні да абсталявання і матэрыялаў, якія ўтрымліваюць поліхларыраваныя біфенілы, вызначаны парадак правядзення інвентарызацыі дыяксінаў-фуранаў, методыкі адбору проб, парадак правядзення аналізаў утрымання ў розных кампанентах і г.д. Але ў той жа час у Міністэрстве прыроды і аховы навакольнага асяроддзя падкрэсліваюць: над нарматыўнай базай неабходна працаваць і далей.

У прыватнасці, Нацыянальным планам выканання абавязкаў, прынятых Рэспублікай Беларусь па Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках прадугледжваецца, што ў наступнай пяцігодцы будуць распрацаваныя і ўведзеныя ў дзеянне прававыя акты і тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты, якія вызначаць парадак аднаўлення парушанага стану тэрыторый, забруджаных САЗ. Апроч таго, ёсць намер распрацаваць і ўвесці ў дзеянне тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты, якія забяспечвалі б правядзенне маніторынгу ўтрымання стойкіх арганічных забруджвальнікаў ва ўсіх кампанентах прыроднага асяродку; распрацаваць і ўкараніць метады эканамічнага стымулявання выкідаў САЗ і выкарыстання найлепшых тэхнічных метадаў; увесці нарматывы ўтрымання САЗ ва ўсіх кампанентах прыроднага асяродку, і ў тым ліку ў выкідах крыніц, якія трапляюць пад дзеянне частак II і III дадатку С да Стакгольмскай канвенцыі.

Не менш важны напрамак — і распрацоўка нарматыўна-прававога акта, які б рэгламентаваў парадак перамяшчэння абсталявання з утрыманнем стойкіх арганічных забруджвальнікаў праз мытную мяжу. Цяпер вывучаюцца магчымасці такога вывазу з Беларусі ў іншыя краіны, прычым пробная партыя ў 19 тон абсталявання з утрыманнем поліхларыраваных біфенілаў ужо трапіла ў Германію. Аднак на сёння тут існуюць пэўныя юрыдычныя «прагалы». І іх ліквідацыя патрэбная для таго, каб надалей прадпрыемствы без перашкод маглі заключаць кантракты на вываз і знішчэнне САЗ за межамі нашай краіны.

### АДНА. ЗАМЕСТ ЧАТЫРОХ

У планах па фарміраванні і ўдасканаленні заканадаўства ёсць і такі пункт — распрацоўка і прыняцце нарматыўнага прававога акта, які будзе рэгламентаваць парадак вядзення Адзінай базы звестак аб стойкіх арганічных забруджвальніках. І гэты пункт з'явіўся зусім не выпадкова.

— На папярэднім этапе былі створаны чатыры асобныя базы звестак — аб непрыгодных пестыцыдах, аб'ектах іх размяшчэння і тэрыторыях, забруджаных пестыцыдамі; аб матэрыялах, абсталяванні і адходах з утрыманнем поліхларыраваных біфенілаў; база аб крыніцах выкідаў САЗ у выніку іх ненаўмыснай вытворчасці; аб звестках маніторынгу САЗ у рамках Нацыянальнага маніторынгу навакольнага асяродку, — працягвае Вольга Сазонава. — Цяпер жа плануецца стварыць Адзіную базу аб стойкіх арганічных забруджвальніках, якая будзе ўключаць у сябе адначасова ўсе чатыры гэтыя блокі, а таксама інфармацыйна-даведачны і картаграфічны блок. І зразумела, што Адзіная база звестак аб САЗ будзе пастаянна актуалізавацца.

### ЗАХАВАННЯЎ НЕПРЫДАТНЫХ ПЕСТЫЦЫДАЎ СТАНЕ МЕНШ

Не сакрэт, што на працягу бліжэйшых гадоў застануцца надзённымі і пытанні абыходжання з непрыдатнымі пестыцыдамі. І ў тым ліку з пестыцыдамі, якія залічваюцца да стойкіх арганічных забруджвальнікаў.

— У 2011—2015 гадах працягнецца работа па экалагічна бяспечным зборы і захоўванні пестыцыдаў, якія адносяцца да стойкіх арганічных забруджвальнікаў, з мэтай іх далейшага абясшкоджвання, — канстатуе Вольга Сазонава. — Будзе завершана работа па пераўпакоўцы непрыдатных пестыцыдаў для іх працяглага бяспечнага захоўвання, ёсць намер распрацаваць мерапрыемствы па выяўленні і аднаўленні парушанага стану тэрыторый, забруджаных пестыцыдамі, якія залічваюцца да САЗ, а таксама наладзіць вываз непрыдатных пестыцыдаў за межы нашай краіны для іх знішчэння экалагічна бяспечным спосабам. Дарэчы, ужо цяпер рыхтуецца пакет дакументацыі для правядзення тэндара — у выніку яго будзе выбрана арганізацыя, якая і зоймецца знішчэннем непрыдатных пестыцыдаў, якія будуць вымацца са Слонімскага захавання.

У рамках Нацыянальнага плана прадугледжваецца і такі пункт — знішчэнне Слонімскага на Гродзеншчыне і ці не найбольш патэнцыйна небяспечнага для навакольнага асяроддзя Гарадоцкага на Віцебшчыне захаванняў непрыдатных пестыцыдаў.

### ДЗЕ ХАРЧАВАННЕ, ТАМ БЕЗ ПХБ

Будуць знаходзіцца ў цэнтры ўвагі і пытанні абыходжання з абсталяваннем, матэрыяламі і адходамі, якія ўтрымліваюць поліхларыраваныя біфенілы.

— Нацыянальны план на наступную пяцігодку вызначае працяг работы па інвентарызацыі, маркіроўцы абсталявання і адходаў, якія ўтрымліваюць поліхларыраваныя біфенілы, прадугледжвае выкарыстанне ПХБ толькі ў непашкоджаным і герметычным абсталяванні, забеспячэнне кантролю за выкарыстаннем абсталявання з утрыманнем ПХБ і кантролю за своечасовым выяўленнем уцечак ПХБ, — зазначае Вольга Сазонава. — Нацыянальны план таксама прадугледжвае недапушчэнне рэкуперацыі поліхларыраваных біфенілаў, недапушчэнне выкарыстання абсталявання з утрыманнем ПХБ на прадпрыемствах па вытворчасці кармоў і прадуктаў харчавання. Будзе працягнутая работа па вывадзе з эксплуатацыі і дэмантажы абсталявання з утрыманнем ПХБ (з улікам заканчэння такіх работ да 2025 года). У планах таксама выяўленне і аднаўленне парушанага стану тэрыторый у выніку забруджвання ПХБ, а яшчэ — вываз часткі абсталявання і адходаў з утрыманнем поліхларыраваных біфенілаў для знішчэння за межы Беларусі.

### МАНІТОРЫНГ З НОВЫМІ НАПРАМКАМІ

У 2011—2015 гадах у Беларусі працягнецца маніторынг ўтрымання стойкіх арганічных забруджвальнікаў у навакольным асяроддзі. У прыватнасці, запланавана набыццё абсталявання і арганізацыя кантролю за ўтрыманнем САЗ ва ўсіх кампанентах прыроднага асяроддзя; забеспячэнне правядзення сістэматычных назіранняў за ўтрыманнем САЗ паводле ўстаноўленых рэгламентаў у вызначаных для такіх назіранняў пунктах (раёны размяшчэння існуючых і выведзеных з эксплуатацыі захаванняў непрыдатных пестыцыдаў, аб'ектаў размяшчэння прамысловых і камунальных адходаў і г.д.); распрацоўка нарматываў парогавых значэнняў утрымання САЗ у аб'ектах навакольнага асяроддзя для фарміравання падыходаў да ацэнкі стану навакольнага асяроддзя і ўзроўню ўздзеяння на яго аб'екты існуючых і патэнцыяльных крыніц стойкіх арганічных забруджвальнікаў. Плюс да таго будзе наладжаны маніторынг «новых» САЗ у аб'ектах навакольнага асяроддзя; фарміраванне сеткі пунктаў назіранняў на падставе дзейнага маніторынгу і распрацоўка адпаведных рэгламентаў назірання; будзе зроблена ацэнка нацыянальнага тэхнічнага і метадычнага патэнцыялаў для арганізацыі сістэматычных назіранняў за ўтрыманнем «новых» 9 стойкіх арганічных забруджвальнікаў у аб'ектах навакольнага асяродку; распрацаваная і рэалізаваная праграма навукова-практычных семінараў з удзелам спецыялістаў лабараторных службаў органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый для абмену вопытам у галіне сучасных тэхналогій і метадаў адбору і правядзення выпрабавальных проб розных асяродкаў на ўтрыманне САЗ.

— Гаворка аб «новых» стойкіх арганічных забруджвальніках ідзе па вельмі простай прычыне, — тлумачыць Вольга Сазонава. — Справа ў тым, што першапачаткова Стакгольмская канвенцыя вызначыла 12 САЗ: дзевяць з іх — гэта хлоразмяшчальныя пестыцыды (альдрын, дыльдрын, хлардан, ДДТ (дыхлор-дыфеніл-трыхлорэтан), эндрын, гептахлор, гексахлорбензол, міракс і таксафен), поліхларыраваныя біфенілы (ПХБ) і выкіды поліхларыраваных дыбенза-n-дыякінаў і дыбензафуранаў, гексахлорбензолу і ПХБ (дыяксіны і фураны). Аднак потым «чорны спіс» павялічыўся. У прыватнасці, на чацвёртай нарадзе Канферэнцыі Бакоў Стакгольмскай канвенцыі да САЗ былі аднесены з выключэннямі хлордэкон, гексабромдыфеніл, пентахлорбензол, ліндан, альфа-гексахлорцыклагексан, бета-гексахлорцыклагексан, тэтрабромдыфенілавы эфір і пентабромдыфенілавы эфір (камерцыйны пентабромдыфенілавы эфір), гексахлордыфенілавы эфір і гептабромдыфенілавы эфір (камерцыйны актабромдыфенілавы эфір), перфтарактанавая сульфонавая кіслата, яе солі і перфтарактанавыя сульфанілфтарыды. Прычым было вырашана ўключыць хлордэкон, гексабромдыфеніл, альфа-гексахлорцыклагексан, бета-гексахлорцыклагексан у забаронены пералік А, а пентахлорбензол — у пералік С. У тым жа пераліку А апынуўся і ліндан, праўда, з агаворкай — працягваць яго выкарыстанне дазволена ў фармацэўтычных мэтах. Нарэшце, у пераліку Канвенцыі таксама ўвайшлі пентабромдыфенілавы эфір і актабромдыфенілавы эфір — з дазволам перапрацоўкі і экспарту тавараў, якія ўтрымліваюць гэтыя рэчывы, да 2030 года.

### САННАГЛЯД ПОЙДЗЕ Ў ЛАД

Адначасова працягнецца маніторынг стану здароўя насельніцтва ў сувязі з уздзеяннем стойкіх арганічных забруджвальнікаў. Запланавана распрацоўка і ўкараненне метадаў папярэджання і мінімізацыі шкоднага ўздзеяння САЗ на здароўе чалавека; укараненне маніторынгу функцыянальных парушэнняў у арганізме чалавека ў сувязі з уздзеяннем САЗ, а таксама ўкараненне метадаў якаснага экспрэс-аналізу дыяксінаў, фуранаў і поліхларыраваных біфенілаў у практыку дзяржаўнага санітарнага нагляду.








### ВЫКІДЫ — У «МІНУС»

У планах для скарачэння выкідаў стойкіх арганічных забруджвальнікаў у выніку іх ненаўмыснай вытворчасці — аснашчэнне прадпрыемстваў новым сучасным ачышчальным абсталяваннем, распрацоўка галіновых планаў па зніжэнні выкідаў САЗ, выхад на нормы ўтрымання САЗ у выкідах у металургіі і машынабудаванні, энергетыцы, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, хімічнай і нафтахімічнай вытворчасці, дрэваапрацоўчай прамысловасці, у жыллёва-камунальнай гаспадарцы.

Прадугледжваецца, што да 2015 года будзе забяспечана скарачэнне нацыянальных выкідаў САЗ для дыяксінаў/фуранаў і поліхларыраваных біфенілаў пры вытворчасці металаў і пры спальванні адходаў на 10 працэнтаў, а для поліараматычных вуглевадародаў і гексахлорбензолу пры спальванні паліва ў маламагутных кацельных устаноўках і пры спальванні адходаў — на 5 працэнтаў. Ёсць намер укараніць газаачышчальнае абсталяванне з эфектыўнасцю ачысткі для рукаўных фільтраў больш за 98 працэнтаў і для мокрых пылаўлоўнікаў больш за 95 працэнтаў на сталеплавільных і індукцыйных печках, вагранках у металургічнай вытворчасці; укараніць першасныя метады зніжэння выкідаў, у прыватнасці, укараніць сістэмы ачысткі металалому ад масла да загрузкі ў тэхналагічныя агрэгаты, вызначыць больш жорсткія патрабаванні да паставак металалому, яго сарціроўкі і ачысткі ад забруджванняў; укараніць тэхналогіі, якія забяспечваюць поўнае спальванне і мінімізацыю аб'ёмаў адыходных газаў у кацельных устаноўках. Плануецца змяншэнне лішкаў паветра і павелічэнне каэфіцыента карыснага дзеяння малых паліваспальвальных установак, узмацненне кантролю працэсаў гарэння на малых паліваспальвальных устаноўках.

### АД БРАШУРЫ І ДА САЙТА

Наступны блок Нацыянальнага плана — працяг інфармацыйна-асветніцкай работы. Тут плануецца выданне разнастайных брашур, плакатаў, улётак і іншых інфармацыйных матэрыялаў па пытаннях стойкіх арганічных забруджвальнікаў; забеспячэнне функцыянавання інтэрнэт-сайта па САЗ і зноў жа правядзенне конкурсу праектаў грамадскіх аб'яднанняў, накіраваных на павышэнне ўзроўню ведаў насельніцтва па гэтай тэме.

### СВАЁ ЗАЎСЁДЫ ЛЕПШ

І колькі слоў пра навуковае і тэхнічнае забеспячэнне ў галіне абыходжання са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі. Адметны напрамак у гэтым плане — правядзенне ацэнкі наяўнасці ў Беларусі тых жа «новых» САЗ, іх інвентарызацыя і ўнясенне ў базу звестак.

— Апроч таго, разглядаецца магчымасць закупкі абсталявання і ўводу ў эксплуатацыю ў Беларусі прадпрыемства па абясшкоджванні экалагічна бяспечным спосабам стойкіх арганічных забруджвальнікаў — сёння такое знішчэнне магчымае толькі за мяжой, — кажа Вольга Сазонава. — Прычым патрэба ў падобным прадпрыемстве сапраўды вялікая. Тым больш што нельга забываць: апроч САЗ у нашай краіне ёсць і іншыя небяспечныя адходы.

### КРЫНІЦЫ РОЗНЫЯ, МЭТА — АДНА

Прадугледжана, што крыніцамі фінансавання Нацыянальнага плана стануць сродкі рэспубліканскага бюджэту, і ў тым ліку рэспубліканскага фонду аховы прыроды, бюджэтаў абласцей і сталіцы, мясцовых фондаў аховы прыроды, уласныя сродкі прадпрыемстваў і іншыя сродкі, не забароненыя заканадаўствам. Канкрэтныя аб'ёмы грашовых выдаткаў будуць вызначацца са штогадовым удакладненнем пры фарміраванні праектаў бюджэту.

Аднак дзяржаўныя сродкі — яшчэ не ўсё. З улікам таго, што сама па сабе праблема САЗ не мае межаў, для выканання Нацплана ў рамках праекта «Абыходжанне са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі (Кампанент С Комплекснага праекта па абыходжанні з цвёрдымі адходамі ў Рэспубліцы Беларусь) наша краіна атрымае міжнародную тэхнічную дапамогу па лініі Глабальнага экалагічнага фонду/Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця. Атрымальнікам дапамогі стане Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Тэрміны рэалізацыі праекта — 36 месяцаў. Сума дапамогі — 5,5 млн долараў.

— Сродкі міжнароднай тэхнічнай дапамогі пойдуць на розныя мэты, — заўважае кіраўнік праекта Юрый Салаўёў. — Так, грошы будуць накіраваныя на забеспячэнне экалагічна бяспечнага захоўвання непрыдатных пестыцыдаў і адходаў з утрыманнем САЗ; распрацоўку доўгатэрміновага плана мерапрыемстваў па вывадзе з эксплуатацыі абсталявання з утрыманнем поліхларыраваных біфенілаў з далейшым яго абясшкоджваннем; правядзенне навучання супрацоўнікаў лабараторый сістэмы Мінпрыроды методыкам аналізу і маніторынгу САЗ; аснашчэнне адной з абласных лабараторый сістэмы аховы здароўя абсталяваннем для пашырэння сістэмы маніторынгу здароўя насельніцтва ў сувязі з утрыманнем САЗ у прадуктах харчавання і пітной вадзе; на стварэнне Адзінай аўтаматызаванай базы звестак САЗ. Дзякуючы міжнароднай дапамозе плануецца павысіць узровень дасведчанасці нашых людзей наконт САЗ і мерах, якія спрыяюць скарачэнню іх шкоднага ўплыву на здароўе; плануецца падрыхтаваць прапановы па ўдасканаленні заканадаўства па абыходжанні са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі — і ў тым ліку з прыцягненнем міжнародных экспертаў.

Аднак ці не самае адметнае — за сродкі дапамогі будзе ліквідаванае Слонімскае захаванне непрыдатных пестыцыдаў і вывезена на экалагічна бяспечнае знішчэнне 1000 тон непрыдатных пестыцыдаў і 816 тон адходаў з утрыманнем ПХБ з 16 прадпрыемстваў, напрыклад, з МТЗ, МАЗа, «Паліміра», «Нафтана» і г.д. Праўда, тут варта зрабіць заўвагу: адной з умоў аказання дапамогі на вываз абсталявання з ПХБ за мяжу з'яўляецца частковае суфінансаванне ўласнікамі гэтага абсталявання. Скажам, як варыянт, прадпрыемствы-ўласнікі возьмуць на сябе выдаткі па зборы, упакоўцы, пагрузцы, а, магчыма, і па транспарціроўцы.

— Безумоўна, міжнародны праект не вырашыць праблему стойкіх арганічных забруджвальнікаў у Беларусі цалкам, — зазначае Вольга Сазонава. — І тым не менш ён дапаможа зрабіць вялікія крокі ў гэтым напрамку. А значыць, мы наблізімся да канчатковай мэты — выканання нашай краінай абавязкаў паводле Стакгольмскай канвенцыі аб САЗ.

**Сяргей ГРЫБ, Віктар ПАЗНЯКОЎ.**

УНП 100519825.

